В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

## Узор разбору

А сок быў свежы, такі хвацкі, такі салодкі, забіяцкі! (Я. Колас).

*Сок* — назоўнік, абазначае прадмет:
(што?) *сок*; пачатковая форма — *сок*;
агульны, неадушаўлёны, рэчыўны; мужчынскага роду; 2-га скланення;
ужыты ў назоўным склоне, адзіночным ліку.
У сказе з'яўляецца дзейнікам.

# Прыметнік як часціна мовы

| | |
|---|---|
| **Агульнае граматычнае значэнне** | абазначае прымету прадмета: блакітнае неба, друкарскі станок, салаўіная песня |
| **Адказвае на пытанні** | які? якая? якое? якія? → шчаслівая пара, вясковая вуліца,<br>чый? чыя? чыё? чые? → бацькаў дом |
| **Пачатковая форма** | Н. скл., адз. л., м. р.: чырвоны, залаты, бабулін |
| **Марфалагічныя прыметы** | Прыметнікі дапасуюцца да назоўнікаў і змяняюцца:<br>• па родах (у адзіночным ліку):<br>м. р.: сіні касцюм,<br>ж. р.: сіняя кветка,<br>н. р.: сіняе неба;<br>• па ліках:<br>новы дом, новыя дамы;<br>• па склонах:<br>Н., Р., Д., В., Т., М.;<br>• могуць мець ступені параўнання (якасныя):<br>вышэйшую (святлейшы),<br>найвышэйшую (найсвятлейшы) |
| **Сінтаксічная роля** | Азначэнне: Ціха ў зімовым лесе.<br>Выказнік: Неба высокае. |



© ТДА «Аверсэв»

# Разрады прыметнікаў

| Разрад<br>Пытанні | Абазначаюць | Граматычныя асаблівасці |
|---|---|---|
| Якасныя<br>які?<br>якая?<br>якое?<br>якія? | прыметы прадметаў паводле:<br>- колеру: белы, зялёны;<br>- смаку: горкі, салодкі;<br>- знешніх, фізічных, душэўных якасцей: прыгожы, дужы, добры;<br>- формы: круглы, вузкі, кароткі;<br>- тэмпературы: цёплы, гарачы;<br>- агульнай ацэнкі: любімы, свабодны | - могуць утвараць ступені параўнання: белы — бялейшы — найбялейшы;<br>- маюць формы ацэнкі, якасці: белаваты, бялюткі, бялюсенькі;<br>- маюць антонімы: белы — чорны;<br>- могуць мець поўную і кароткую формы: прыгожы, прыгож;<br>- спалучаюцца са словамі вельмі, надта |
| Адносныя<br>які?<br>якая?<br>якое?<br>якія? | прыметы прадметаў паводле:<br>- матэрыялу: алавяны, жытні;<br>- месца, прасторы: палявы, слуцкі;<br>- меры, вагі: літровы, пяцітонны;<br>- часу: учарашні, асенні | - не маюць ступеней параўнання;<br>- не маюць кароткіх формаў;<br>- не маюць формаў ацэнкі;<br>- не ўтвараюць антанімічных пар;<br>- не спалучаюцца са словамі вельмі, надта |
| Прыналежныя<br>чый?<br>чыя?<br>чыё?<br>чые? | прыметы прадметаў паводле іх прыналежнасці:<br>- чалавеку: сынаў, Янукоў;<br>- жывёле: лісіны;<br>- птушцы: сакаліны | - у вінавальным склоне маюць кароткую форму: братаў, братава; Алёнчын, Алёнчына |
| Пры пераносным ужыванні адносныя прыметнікі набываюць значэнне якасных (залаты гай), а якасныя — значэнне адносных (белая гарачка) | | |



© ТДА «Аверсэў»

# Ступені параўнання якасных прыметнікаў

| Ступені | Формы: простая | Формы: складаная | Не ўтвараюць ступеней параўнання |
|---|---|---|---|
| Вышэйшая | зялён[ы] + ейш → зеленейшы<br>прыгож[ы] + эйш → прыгажэйшы<br>але: вялікі → больш**ы**<br>добры → лепш**ы**<br>дрэнны → горш**ы** | больш (болей) + зялёны → больш (болей) зялёны<br>менш (меней) + прыгожы → менш (меней) прыгожы | прыметнікі, што абазначаюць якасці, якія не могуць праяўляцца ў большай ці меншай ступені:<br>1) нязменныя якасці: босы, глухі, халасты, лысы, крывы і да т. п.;<br>2) масці жывёл: буланы, гнядыя, вараны;<br>3) колеры тыпу: крэмавы, попельны, васільковы |
| Найвышэйшая | най + зелянейшы → найзелянейшы<br>най + прыгажэйшы → найпрыгажэйшы<br>най + большы → найбольшы<br>най + лепшы → найлепшы<br>най + горшы → найгоршы | самы + зялёны → самы зялёны<br>найбольш + прыгожы → найбольш прыгожы<br>найменш + прыгожы → найменш прыгожы | |

Пры простай форме вышэйшай ступені параўнання назоўнік ці займеннік ставіцца ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам за: Пугач крыху меншы за шпака.

© ТДА «Аверсэв»

# Поўныя і кароткія якасныя прыметнікі

| Граматычныя асаблівасці | Поўная форма | Кароткая форма |
| --- | --- | --- |
| Змяняюцца | • па родах (у адзіночным ліку): сіні колер, сіняя фарба, сіняе неба;<br>• па ліках: радасны настрой, радасныя дзеці;<br>• па склонах: вясёлы, вясёлага і г. д. | • па родах (у адзіночным ліку): сын рад, дачка рада, дзіця рада;<br>• па ліках: рад, рада, рада — рады;<br>• не скланяецца (мае толькі формы назоўнага склону) |
| Маюць канчаткі | • м. р. -ы, -і: мілы, вялікі;<br>• ж. р. -ая, -яя: мілая, вялікая, сіняя;<br>• н. р. -ае, -яе, -ое: мілае, сіняе, дарагое | • м. р. нулявы: міл□, вялік□ (край);<br>• ж. р. -а: міла, люба (дачка);<br>• н. р. -а: міла, люба (дзіця) |
| Сінтаксічная роля | Азначэнне: Маўкліва стаялі старыя бярозы.<br>Выказнік: Хвост у арлана белы. | Выказнік: Першыя громы! Сэрцу вы мілы, люб мне ваш смех паміж гор. |



© ТДА «Аверсэв»

# Канчаткі якасных і адносных прыметнікаў

Адрозніваюцца два тыпы скланення прыметнікаў: скланенне якасных і адносных прыметнікаў; скланенне прыналежных прыметнікаў. Канчаткі ў адзіночным ліку залежаць ад характару асновы і націску.

## Скланенне прыметнікаў з націскам на аснове

| Склон | Адзіночны лік | | | | | | | | | Множны лік |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | цвёрды і зацвярдзелы зычны | | | г, к, х | | | мяккі зычны | | | |
| | м. р. | н. р. | ж. р. | м. р. | н. р. | ж. р. | м. р. | н. р. | ж. р. | |
| Н. | мі́лы ду́жы | мі́лае ду́жае | мі́лая ду́жая | я́ркі ці́хі | я́ркае ці́хае | я́ркая ці́хая | сі́ні по́зні | сі́няе по́зняе | сі́няя по́зняя | мі́лыя ду́жыя я́ркія сі́нія |
| Р. | мі́лага ду́жага | | мі́лай ду́жай | я́ркага ці́хага | | я́ркай ці́хай | сі́няга по́зняга | | сі́няй по́зняй | мі́лых ду́жых я́ркіх сі́ніх |
| Д. | мі́ламу ду́жаму | | мі́лай ду́жай | я́ркаму ці́хаму | | я́ркай ці́хай | сі́няму по́зняму | | сі́няй по́зняй | мі́лым ду́жым я́ркім сі́нім |
| В. | як Н. або Р. | | мі́лую ду́жую | як Н. або Р. | | я́ркую ці́хую | як Н. або Р. | | сі́нюю по́знюю | як Н. або Р. |
| Т. | мі́лым ду́жым | | мі́лай(-аю) ду́жай(-аю) | я́ркім ці́хім | | я́ркай(-аю) ці́хай(-аю) | сі́нім по́знім | | сі́няй(-яю) по́зняй(-яю) | мі́лымі ду́жымі я́ркімі сі́німі |
| М. | (аб) мі́лым ду́жым | | мі́лай ду́жай | (аб) я́ркім ці́хім | | я́ркай ці́хай | (аб) сі́нім по́знім | | сі́няй по́зняй | (аб) мі́лых ду́жых я́ркіх сі́ніх |
| У множным ліку прыметнікі не змяняюцца па родах і склонавыя канчаткі ва ўсіх родах супадаюць | | | | | | | | | | |

© ТДА «Аверсэў»

## Скланенне прыметнікаў з націскам на канчатку

| Склон | Адзіночны лік | | | | | | Множны лік | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | цвёрды і зацвярдзелы зычны | | | г, к, х | | | | |
| | м. р. | н. р. | ж. р. | м. р. | н. р. | ж. р. | | |
| Н. | малы́<br>стары́ | мало́е<br>старо́е | мала́я<br>стара́я | дарагі́<br>глухі́ | дараго́е<br>глухо́е | дарага́я<br>глуха́я | малы́я<br>стары́я | дарагі́я<br>глухі́я |
| Р. | мало́га<br>старо́га | | мало́й<br>старо́й | дараго́га<br>глухо́га | | дараго́й<br>глухо́й | малы́х<br>стары́х | дарагі́х<br>глухі́х |
| Д. | мало́му<br>старо́му | | мало́й<br>старо́й | дараго́му<br>глухо́му | | дараго́й<br>глухо́й | малы́м<br>стары́м | дарагі́м<br>глухі́м |
| В. | як Н. або Р. | | малу́ю<br>стару́ю | як Н. або Р. | | дарагу́ю<br>глуху́ю | як Н. або Р. | |
| Т. | малы́м<br>стары́м | | мало́й(-о́ю)<br>старо́й(-о́ю) | дарагі́м<br>глухі́м | | дараго́й(-о́ю)<br>глухо́й(-о́ю) | малы́мі<br>стары́мі | дарагі́мі<br>глухі́мі |
| М. | (аб) малы́м<br>стары́м | | мало́й<br>старо́й | (аб) дарагі́м<br>глухі́м | | дараго́й<br>глухо́й | (аб) малы́х<br>стары́х | дарагі́х<br>глухі́х |

Прыметнікі з мяккай асновай націскных канчаткаў не маюць



© ТДА «Аверсэў»

## Утварэнне і скланенне прыналежных прыметнікаў

Прыналежныя прыметнікі ўтвараюцца ад назоўнікаў м. р. пры дапамозе суфіксаў -аў, -еў, -оў, -ёў: братаў, мядзведзеў, леснікоў, Міхасёў; ад назоўнікаў ж. р. — суфіксаў -ін, -ын: пчаліны, Наташын.

| Склон | Адзіночны лік | | | Множны лік |
|---|---|---|---|---|
| | м. р. | н. р. | ж. р. | усе роды |
| Н. | дзядзькаў□ Зосін□ | дзядзькава Зосіна | дзядзькава Зосіна | дзядзькавы Зосіны |
| Р. | дзядзькавага Зосінага | | дзядзькавай Зосінай | дзядзькавых Зосіных |
| Д. | дзядзькаваму Зосінаму | | дзядзькавай Зосінай | дзядзькавым Зосіным |
| В. | як Н. або Р. | | дзядзькаву Зосіну | як Н. або Р. |
| Т. | дзядзькавым Зосіным | | дзядзькавай Зосінай | дзядзькавымі Зосінымі |
| М. | (аб) дзядзькавым Зосіным | | (аб) дзядзькавай Зосінай | (аб) дзядзькавых Зосіных |

• Прыналежныя прыметнікі мужчынскага, жаночага, ніякага роду ў назоўным склоне адзіночным ліку маюць кароткую форму: у мужчынскім родзе — нулявы, у жаночым родзе — -а, у ніякім родзе — не пад націскам -а (дзя́дзькава паліто), пад націскам — -о (даччыно паліто).

• У вінавальным склоне адзіночным ліку прыналежныя прыметнікі мужчынскага і ніякага роду пры неадушаўлёных назоўніках маюць кароткую форму (як у назоўным склоне), а прыметнікі жаночага роду — заўсёды кароткую з канчаткам -у.

• Прыметнікі ўсіх родаў у назоўным склоне множным ліку і ў вінавальным склоне (пры неадушаўлёных назоўніках) маюць кароткую форму.

• У родным, давальным, творным і месным склонах канчаткі прыналежных прыметнікаў такія, як і ў якасных і адносных



© ТДА «Аверсэв»

# Спосабы ўтварэння прыметнікаў

| Спосаб утварэння | Утваральная аснова ці слова | Словаўтваральны сродак | Вытворнае слова |
|---|---|---|---|
| Суфіксальны | жах<br>голас<br>вусы | жах + лів(ы)<br>голас + іст(ы)<br>вус + ат(ы) | жахлівы<br>галасісты<br>вусаты |
| Прыставачны (прэфіксальны) | духоўны<br>гукавы | без + духоўны<br>звыш + гукавы | бездухоўны<br>звышгукавы |
| Нульсуфіксальны | заяц<br>любіць | заяц + ∅(ц → ч)(ы)<br>люб + ∅(ы) | заячы<br>любы |
| Прыставачна-суфіксальны | воля<br>Нёман | бяз + воль + н(ы)<br>пры + нёман + + ск(і) | бязвольны<br>прынёманскі |
| Прыставачна-нульсуфіксальны | голас<br>рукі | без + голас + ∅(ы)<br>бяз + рук + ∅(і) | безгалосы<br>бязрукі |
| Складанне | падобны на дугу<br>цёмны, русы | дуг + а + падобны<br>цёмн + а + русы | дугападобны<br>цёмна-русы |
| Складана-суфіксальны | буйны плод<br>вугаль драбіць | буйн + а + плод + + н(ы)<br>вугл + е + драб + + ільн(ы) | буйнаплодны<br>вугледрабільны |



© ТДА «Аверсэў»

## Правапіс Н і НН у прыметніках

| НН | Н |
|---|---|
| 1) вясна + -н- → вясенні,<br>ячмень + -н- → ячменны;<br>2) імя + -янн- → іменны,<br>стрэмя + -янн- → стрэмянны;<br>**але:** палымяны;<br>3) брытва + -енн- → брытвенны,<br>страх + -энн- → страшэнны | бляха + -ан- → бляшаны,<br>салома + -ян- → саламяны,<br>салавей + -ін- → салаўіны,<br>ластаўка + -ын- → ластаўчыны |

## Утварэнне і правапіс прыметнікаў з суфіксам -ск-

| | | |
|---|---|---|
| 1) | к + -ск- = цк:<br>т + -ск- = цк:<br>ч + -ск- = цк:<br>ц + -ск- = цк: | мастак + -ск- → мастацкі;<br>дэпутат + -ск- → дэпутацкі;<br>Асіповічы + -ск- → асіповіцкі;<br>выдавец + -ск- → выдавецкі |
| 2) | д + -ск- = дск: | сусед + -ск- → суседскі;<br>Слаўгарад + -ск- → слаўгарадскі |
| 3) | с + -ск- = ск:<br>ш + -ск- = ск: | Беларусь + -ск- → беларускі;<br>таварыш + -ск- → таварыскі |
| 4) | з + -ск- = зск:<br>ж + -ск- = жск:<br>ш + -ск- = шск:<br>г + -ск- = гск:<br>х + -ск- = хск: | Каўказ + -ск- → каўказскі;<br>Дарагабуж + -ск- → дарагабужскі;<br>Добруш + -ск- → добрушскі;<br>Ютэборг + -ск- → ютэборгскі;<br>Цюрых + -ск- → цюрыхскі; |
| **але:** Волга + -ск- → волжскі, Рыга + -ск- → рыжскі (г → ж) | | |
| 5) | з + -ск- = зск:<br>к + -ск- = кск:<br>х + -ск- = хск:<br>ш + -ск- = шск: | француз + -ск- → французскі;<br>узбек + -ск- → узбекскі;<br>казах + -ск- → казахскі;<br>латыш + -ск- → латышскі; |
| **але:** славак + -ск- → славацкі, калмык + -ск- → калмыцкі, турак + -ск- → турэцкі, чэх + -ск- → чэшскі | | |



© ТДА «Аверсэв»

# Правапіс складаных прыметнікаў

| Разам | Праз злучок |
|---|---|
| Прыметнікі, утвораныя ад:<br>1) складаных назоўнікаў, што пішуцца разам: землягроб → земляробскі, Наваполацк → наваполацкі;<br>2) спалучэнняў, у якіх адно слова залежыць ад другога: сельскагаспадарчы (сельская гаспадарка), сямігадовы (сем гадоў);<br>3) геаграфічных назваў, якія па форме з'яўляюцца спалучэннямі «прыметнік + назоўнік»: заходнесібірскі (Заходняя Сібір), паўднёвакарэйскі (Паўднёвая Карэя);<br>4) спалучэння прыслоўя з прыметнікам (дзеепрыметнікам): высокамаральны, вышэйсказанае;<br>5) тэрміны з дзвюх ці трох асноў: усходнеславянскі (народ), верхнялу́жыцкая (мова);<br>6) складаныя прыметнікі з пачатковай часткай ваенна: ваеннапалонны, ваеннапалявы | Прыметнікі, утвораныя ад:<br>1) складаных назоўнікаў, што пішуцца праз злучок: сацыял-дэмакрат → сацыял-дэмакратычны;<br>2) двух і больш раўнапраўных прыметнікаў (паміж імі можна паставіць злучнік і): фізіка-матэматычны гурток, чорна-белы фільм, беларуска-руска-лацінскі слоўнік;<br>3) прыметнікі, якія абазначаюць якасці (колер, смак) з дадатковым адценнем: светла-сіні касцюм, кісла-салодкі яблык, бледна-шэрыя дрэвы;<br>4) прыметнікі з першай часткай усходне-, заходне-, паўднёва-, паўночна- са значэннем:<br>а) геаграфічных назваў: Усходне-Сібірскае мора, Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка;<br>б) напрамкаў свету: паўднёва-заходні вецер, паўночна-ўсходні напрамак;<br>5) утвораныя ад імён і прозвішчаў: леў-талстоўскі, паўлюк-багрымаўскі |

# Правапіс НЕ (НЯ) з прыметнікамі

| Разам | Асобна |
|---|---|
| 1. Калі прыметнік без не (ня) не ўжываецца: ненаедны, невуцкі, нябесны, нягеглы.<br>2. Калі прыметнік з не (ня) можна замяніць сінонімам без не (ня): небагаты (бедны), нямоцны (слабы) | 1. Калі ёсць ці падразумяваецца супрацьпастаўленне: не ваенны, а мірны год; мы ж вам не чужыя.<br>2. Калі ўжываюцца словы далёка не, зусім не, нічуць не: зусім не прымальны варыянт, нічуць не асцярожны крок |



© ТДА «Аверсэв»

# Марфалагічны разбор прыметніка

## Парадак разбору

1. Часціна мовы. Агульнае значэнне.
2. Пачатковая форма (Н. скл., адз. л., м. р.).
3. Марфалагічныя прыметы:
а) нязменныя: разрад паводле значэння (якасны, адносны ці прыналежны);
б) зменныя: у якасных ступень параўнання, кароткая ці поўная форма; ва ўсіх прыметніках — род, лік, склон.
4. Сінтаксічная роля.

## Узор разбору

Сыпле іней на бярозы, туліць дрэвы *лёгкім* пухам (Я. Колас).

*Лёгкім* (пухам) — прыметнік, абазначае прымету прадмета: пух (які?) *лёгкі*.

Пачатковая форма *лёгкі*, якасны, форма поўная, ужыты ў мужчынскім родзе, адзіночным ліку, творным склоне.

У сказе з'яўляецца азначэннем.

© ТДА «Аверсэв»